

# Гомельскі ўніверсітэт

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 18 (805) | Аўторак, 21 мая 1991 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 3 кап.

## СТЫПЕНДЫІ І ПРЭМІІ КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

**У адпаведнасці з рэзалюцыямі XXXI з'езда КПБ «Аб палітыцы Кампартыі Беларусі ў галіне адукацыі, навукі і культуры» і «Аб маладзёжнай палітыцы Кампартыі Беларусі» Сакратарыят ЦК КПБ прыняў рашэнне аб устанаўленні стыпендый імя П. М. Машэрава Кампартыі Беларусі, прэмій КПБ ў галіне сацыяльна-палітычных і гуманітарных навук.**

Стыпендыі імя П. М. Машэрава Кампартыі Беларусі будуць прысуджацца, пачынаючы з 1991/92 навучальнага года, студэнтам вышэйшых навучальных устаноў і аспірантам за асаблівыя поспехі ў вучобе, актыўную навуковую і грамадскую работу. Устаноўлена пяць стыпендый па 100 рублёў у месяц для студэнтаў ВНУ і дзве стыпендыі па 150 рублёў у месяц для аспірантаў.

Кандыдатуры на атрыманне стыпендый імя П. М. Машэрава вылучаюцца партыйнымі арганізацыямі ВНУ і навуковых устаноў сумесна з камсамольскімі арганізацыямі, саветамі ВНУ і вучонымі саветамі навуковых устаноў. Прысуджэнне стыпендый імя П. М. Машэрава ўскладаецца на камісію ЦК Кампартыі Беларусі, якая зацвярджаецца Сакратарыятам ЦК КПБ з ліку камуністаў — выкладчыкаў ВНУ, вучоных, прадстаўнікоў партыйных камітэтаў тэрмінам на 3 гады. Назначэнне стыпендый студэнтам ВНУ праводзіцца два разы ў год па выніках экзаменацыйнай сесіі, пачынаючы з шостага семестра, аспірантам — адзін раз у год, пачынаючы з другога года навучання. Выплата стыпендый ажыццяўляецца партыйнымі камітэтамі або бюро ВНУ і навуковых устаноў. Назначэнне стыпендый імя П. М. Машэрава Кампартыі Беларусі не з'яўляецца падставай для спынення выплаты дзяржаўных і іншых стыпендый.

Прэміі Кампартыі Беларусі прысуджаюцца за лепшыя распрацоўкі ў галіне сацыяльна-палітычных і гуманітарных навук. Устаноўлены дзве прэміі за навуковыя працы і адна за падручнікі. Яны прысуджаюцца адзін раз у два гады, пачынаючы з 1993 года. Размер прэміі 5.000 рублёў.

Вылучэнне работ на атрыманне прэміі Кампартыі Беларусі робіцца пярвічнымі партарганізацыямі, абласнымі, гарадскімі, раённымі камітэтамі КПБ, прэзідыумам АН БССР, калегіямі міністэрстваў і ведамстваў, вучонымі саветамі навуковых устаноў і ВНУ, творчымі і грамадскімі арганізацыямі ў асобе іх рэспубліканскіх органаў.

Прэміі Камуністычнай партыі Беларусі прысуджаюцца за даследаванні, якія ўносяць буйны ўклад у развіццё сацыяльна-палітычных і гуманітарных навук, садзейнічаюць паскарэнню эканамічнага, сацыяльнага, духоўнага прагрэсу рэспублікі, узбагачаюць і паглыбляюць тэарэтычную базу КПБ, а таксама за лепшыя падручнікі па сацыяльна-палітычных і гуманітарных дысцыплінах для вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальна-адукацыйных школ, прафтэхвучылішчаў і для сістэмы палітычнай і эканамічнай вучобы працоўных, якія атрымалі шырокае грамадскае прызнанне. Навуковыя працы, вылучаемыя на атрыманне прэміі, павінны быць апублікаваны ў друку не менш чым за год да прадстаўлення іх на прэмію, а падручнікі — не менш чым за два гады. Не дапускаецца вылучэнне на атрыманне прэміі Кампартыі Беларусі работ, удастоеных або вылучаных на атрыманне Ленінскай прэміі, Дзяржаўнай прэміі СССР, прэміі Савета Міністраў БССР, дзяржаўных прэмій іншых рэспублік. Калектыў, прадстаўлены на атрыманне прэміі КПБ, павінен уключаць толькі асноўных аўтараў, і яго колькасць не павінна перавышаць шасці чалавек. У састаў аўтарскага калектыву саіскальнікаў могуць быць уключаны асобы, якія не з'яўляюцца грамадзянамі БССР і СССР, але выканалі работу па сумесных з арганізацыямі рэспублікі планах і праграмах і вылучаны гэтымі арганізацыямі.

Прысуджэнне прэмій ускладаецца на камітэт па прэміях Кампартыі Беларусі, які фарміруецца з ліку буйных вучоных і спецыялістаў, прадстаўнікоў парткомаў і зацвярджаецца Бюро ЦК КПБ тэрмінам на чатыры гады.

Работы, вылучаныя на атрыманне прэміі Камуністычнай партыі Беларусі, разглядаюцца камітэтам у два этапы. На першым этапе адбіраюцца работы для ўдзелу ў конкурсе на атрыманне прэмій, на другім — прымаецца рашэнне аб прысуджэнні прэмій.

Для шырокага азнаямлення грамадскасці з допушчанымі да ўдзелу ў конкурсе работамі спіс з указаннем іх аўтараў і арганізацый, якія вылучылі гэтыя работы, публікуецца ў лютым у партыйным друку. Разглядаемыя камітэтам работы павінны ўсебакова абмяркоўвацца ў пярвічных партыйных арганізацыях і працоўных калектывах, на пасяджэннях партыйных камітэтаў, вучоных, рэдакцыйна-выдавецкіх саветаў, у творчых і іншых грамадскіх арганізацыях, у друку, тэле- і радыёперадачах, на сходах грамадскасці. Матэрыялы гэтых абмеркаванняў, водгукі, заўвагі і прапановы накіроўваюцца ў камітэт і ўлічваюцца пры разглядзе работ, прадстаўленых на атрыманне прэміі Кампартыі Беларусі.

Рашэнне камітэта аб прысуджэнні прэміі КПБ уступае ў сілу пасля зацвярджэння яго Бюро ЦК, пастанова якога публікуецца ў партыйным друку. Асобам, удастоеным прэміі Камуністычнай партыі Беларусі, прысвойваецца званне «Лаўрэат прэміі Камуністычнай партыі Беларусі». Уручэнне прэмій прымяркоўваецца да 1 студзеня — дня ўтварэння Кампартыі Беларусі.

Сакратарыятам ЦК КПБ прынята рашэнне аб утварэнні спецыяльнага фонду КПБ, які фарміруецца са сродкаў партыйнага бюджэту, уключаючы добраахвотныя ўклады пярвічных партарганізацый, калектываў і грамадзян, і прызначаны для выплаты стыпендый і прэмій Кампартыі Беларусі.

Палажэнні аб стыпендыях і прэміях Кампартыі Беларусі не прадугледжваюць абавязковую прыналежнасць саіскальнікаў да КПБ.

## ЗАРПЛАТА ПАВЫСІЦЦА ЎСІМ

### ТОЛЬКІ ЦІ БУДЗЕ ЯНА ДАСТАТКОВАЙ?

**У папярэднім нумары нашай газеты быў змешчаны матэрыял пад загалоўкам «Аб новай аплаце працы». Ён выклікаў у чытачоў вялікую цікавасць, а многіх з іх — не задаволіў. Справа ў тым, што ў публікацыі ўказваліся новыя аклады для прафесарска-выкладчыцкага саставу, а для астатняй катэгорыі работнікаў ВНУ — не. Гэтым і тлумачацца шматлікія званкі ў рэдакцыю. Таму зробім некаторыя дапаўненні.**

Па-першае, скажам: як паведаміла нам галоўны бухгалтар І. А. Курава, Міністэрства народнай адукацыі БССР пералічыла ўжо дадатковыя сродкі на рахунак універсітэта для павышаных акладаў прафесарска-выкладчыцкаму саставу і робіцца адпаведны пералік за мінулы месяц.

Цяпер аб некаторых пасадавых акладах кіраўнікоў ВНУ. Аклад рэктара — 800 руб.; прарэктара, прафесара або доктара навук — 750; прарэктара, дацэнта або кандыдата навук — 680; прарэктара без вучонай ступені — 480; галоўнага бухгалтара і галоўнага інжынера — 380; начальнікаў: вучэбнага аддзела — 360, аддзела тэхнічных сродкаў навучання, галоўнага механіка і галоўнага энергетыка — 340; кіраўнікоў вытворчай практыкі, студэнцкага даследчыка бюро, загадчыка аспірантуры, музея, кабінета, падрыхтоўчага аддзялення і інш. — 320; начальніка аддзела аховы працы і тэхнікі бяспекі — 300.

Аклады і стаўкі для работнікаў універсітэта, якія не ўваходзяць у прафесарска-выкладчыцкі састаў, будуць павялічаны да 40% у залежнасці ад вынікаў пераатэстацыі іператарыфікацыі. Яны таксама ўводзяцца з красавіка г. г. і выплата з адпаведным пералікам адбудзецца пасля паступлення з Міністэрства народнай адукацыі БССР дадатковых сродкаў на рахунак універсітэта.

## БЫЛО ЧАМУ ПАВУЧЫЦЦА

Добрушскі раён — адзін з лепшых не толькі ў нашай вобласці, але і ў рэспубліцы па пастаноўцы народнай адукацыі. Тут распрацавана комплексная мэтавая праграма, у якой адлюстраваны перспектыва і ўсе патрэбы як у кадрах, так і матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні кожнай школы на перыяд да 1995 года. Таму з'яўляецца заканамерным, што іменна Добрушстаў месцам правядзення семінара-нарады па праблемах народнай адукацыі. Ён праходзіў у зале пасяджэнняў РК КПБ. У семінары-нарадзе ўдзельнічалі работнікі Міністэрства народнай адукацыі БССР, Гомельскага аблвыканкома і яго ўпраўлення народнай адукацыі, намеснікі старшынь райгарвыканкомаў, загадчыкі аддзелаў народнай адукацыі, прарэктары па вучэбнай рабоце Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф. Скарыны і Мазырскага педінстытута імя Н. К. Крупскай, кіруючыя прафсаюзныя работнікі галіновага прафсаюза.

Семінар-нараду вёў начальнік упраўлення народнай адукацыі аблвыканкома Ф. Р. Забродскі.

Каштоўным вопытам работы перад прысутнымі падзяліліся загадчыкі аддзелаў народнай адукацыі Добрушскіх райвыканкома — В. Ф. Вайцянок, гарвыканкома — Р. А. Касцяневіч.

З цікавасцю былі выслуханы таксама даклады намесніка старшыні аблвыканкома А. М. Ярчака, прарэктара па вучэбнай рабоце нашага універсітэта М. В. Селькіна, старшыні абкома прафсаюза работнікаў народнай адукацыі і навукі У. Я. Курылава.

Семінар-нарада праходзіў у форме «круглага стала». Гэта дазволіла падзяліцца сваімі думкамі па праблемах народнай адукацыі кожнаму пажадаўшаму, што забяспечыла рабоце творчы характар. Яго вынікі дазволяць у значнай ступені больш паспяхова вырашаць тыя важныя задачы, якія стаяць цяпер у галіне народнай адукацыі.

Б. ВАЛОДЗІН.

## НА ПАСЯДЖЭННІ САВЕТА

Адбылося чарговае пасяджэнне Савета кафедр грамадскіх навук. Абмеркавана пытанне аб дзяржаўным экзамене па грамадскіх дысцыплінах. Выказана і прынята прапанова аб мэтазгоднасці ўвядзення сацыяльна-гуманітарнай атэстацыі выпускнікоў універсітэта.

На пасяджэнні Савета ішла размова аб далейшым удасканаленні выкладання і вывучэння грамадска-палітычнага цыкла прадметаў універсітэцкай праграмы.

У рабоце Савета кафедр грамадскіх навук прыняў удзел прарэктар па завочнаму навучанню М. М. Воінаў.

## ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

датэрмінова праводзіць уступны экзамен па наступных дысцыплінах:

— **па беларускай мове і літаратуры** (сачыненне, пазаконкурсны экзамен) — для асоб, якія паступаюць на ўсе педагагічныя спецыяльнасці, акрамя спецыяльнасцей «Беларуская мова і літаратура» і «Руская мова і літаратура»;

— **па матэматыцы** (пісьмова) або (фізіцы) (вусна) (прафілюючы экзамен);

а) для пераможцаў адпаведных гарадскіх (І, ІІ і ІІІ месцы) і раённых (І і ІІ месцы) алімпіяд; б) вучняў школ «юных» і вучэбна-вытворчага камбіната пры Гомельскім універсітэце па рэкамендацыях кіраўнікоў школ і вучэбна-вытворчых камбінатаў; в) для асоб, якія будуць мець індывідуальныя дагаворы на падрыхтоўку спецыялістаў;

— па адпаведных дысцыплінах — для слухачоў прадметных аддзяленняў факультэта давузаўскай падрыхтоўкі, а таксама слухачоў вячэрняга аддзялення падрыхтоўчых курсаў (па рэкамендацыі дэканата давузаўскай падрыхтоўкі).

Жадаючыя здаваць датэрмінова экзамен павінны падаць у прыёмную камісію заяву на імя рэктара з фотакарткай памерам 3×4 да 22 мая.

Датэрміновы экзамен праводзіцца з 24 па 30 мая 1991 года.

Асобы, якія атрымалі станоўчую адзнаку, вызваляюцца ад здачы адпаведнага прадмета ў перыяд уступных экзаменаў. Жадаючыя палепшыць атрыманую адзнаку могуць удзельнічаць у здачы адпаведнага прадмета ў перыяд правядзення ўступных экзаменаў.

ПРЫЁМНАЯ КАМІСІЯ.

## ПАВЕДАМЛЕННЕ

**Заўтра, 22 мая ў актавай зале адбудзецца агульнауніверсітэцкі партыйны сход. На парадак дня выносіцца пытанне: «Гуманітарызацыя сістэмы адукацыі і задачы партыйнай арганізацыі універсітэта» (дакладчык — член парткома, прарэктар па завочнаму навучанню М. М. ВОІНАЎ).**

**Пачатак сходу — у 16.00.**
**Рэгістрацыя — з 15.30.**

**ПАРТКОМ.**

**Нядаўна супрацоўніца нашай газеты вярнулася з турпаездкі па Іспаніі. Сваімі ўражаннямі яна дзеліцца з чытачамі.**

# ТАМ, ДЗЕ ЎМЕЮЦЬ ЖЫЦЬ



Хто не жадае пабываць за мяжой? Асабліва ў наш час, калі так шмат добрага, часам нават зайздроснага гавораць і пішуць аб жыцці ў капкраінах. Так было і ў мяне. Калі прадставілася такая магчымасць, сумнявалася: ехаць-не ехаць (пуцёўка каштавала нямала), а паглядзець на жыццё за мяжой менавіта сваімі вачыма, адчуць усё гэта на сабе, вельмі хацелася. Дык вось цяпер, пасля вяртання, магу з упэўненасцю сказаць: ехаць варта ў любым выпадку — у матэрыяльным плане пуцёўка акупаецца (хаця Іспанія лічыцца дарагой краінай) і ўражанняў шмат.

Пачну з таго, калі наш самалёт ІЛ-86 прызямліўся ў Мадрыдскім аэрапорце. Сустрэла нас наша гід: маладая дзяўчына, былая руская, зараз жыве ў прыгарадзе Мадрыда і працуе экскурсаводам. З ёй мы зрабілі невялікую экскурсію па сталіцы. Чым гэты горад адрозніваецца ад нашых, дык гэта яркімі вітрынамі, маляўнічымі рэкламнымі шчытамі, толькі не архітэктурай. Сваімі вузкімі вулачкамі Мадрыд нагадвае нашы прыбалтыйскія гарады (**на здымку ўверсе**), машын столькі, што яблыку недзе ўпасці. Гавораць, што ў Мадрыд на сваёй машыне няма сэнсу ехаць, таму што паўдня будзеш шукаць месца для стаянкі. Так, машын шмат, у магазінах яны прадаюцца свабодна, нават па зніжаных цэнах. Рэдка сустрэнеш запыленую машыну, усе ззяюць ад чысціні (**на здымку ўнізе злева**). Аднак у модзе зараз там матаролеры, ездзяць на іх, у асноўным, дзяўчаты.

На наступны дзень раніцай мы ад'язджалі з Мадрыда ў Бінедорм. Калі я выйшла з гасцініцы, мой погляд мімволі спыніўся на рабочым закусачнай «Макдональдс», які старанна вымываў яе вітрыну. І на працягу гэтай паездкі я заўважыла, што там кожны чотка ведае сваё месца і добрасумленна выконвае сваю работу.

Усю паездку апісваць падрабязна няма сэнсу, таму спынюся на самых запамінальных момантах.

Аднойчы мы сядзелі ў мадрыдскім бары. Адзін з наведвальнікаў — іспанец — пачуў, што мы рускія і папрасіў нас дапамагчы яму пазваніць у Маскву, бо ён не ведае рускай мовы. Тут жа, у бары вісіць тэлефон. Не прайшло і мінуты, як мы ўжо размаўлялі з Масквой.

Цяпер аб Бінедорме (**на здымку ўнізе справа**). Гэта невялікі курортны горад на беразе Міжземнага мора. У асноўным, у ім знаходзяцца атэлі і завядзенні для адпачынку. Жылых дамоў вельмі мала. Затое магазінаў, лавачак усялякіх — хоць гаць гаці.

Жылі мы ў добрым атэлі, харчаваліся ў рэстаране: там быў шведскі стол. Гэта вельмі рацыянальна і зручна. Ты выбіраеш тое, чаго табе хочацца, пачынаючы ад закусак і канчаючы фруктамі, і ў той колькасці, якую ты зможаш з'есці. Усім прыемна, так як улічваюцца інтарэсы і наведвальнікаў, і работнікаў рэстарана.

У Бінедорме мы ўжо загаралі, купаліся, хаця вада ў моры была яшчэ халоднай (тэмпература паветра тады была + 25°С). Жадаючыя маглі паплаваць і ў басейне, які знаходзіцца каля кожнага атэля. Гэты горад пакінуў у мяне нават больш уражанняў, чым Мадрыд. Атэлі ўсе белыя, вакол пальмы, удалечыні горы, чысціня ў горадзе ідэальная, пах мора. Тыя ж яркія вітрыны, усюды гучыць музыка: у кафэ, магазінах, рэстаранах. Сапраўды, горад адпачынку. Калі мы вярталіся з Бінедорма, мяне прыемна здзівіла вось што: у аўтобусе ніякой таўкатні, усе на сваіх месцах, а каб дарога не здавалася сумнай і доўгай, каля шафёра ўстаноўлены відэамагнітафон.

І галоўнае, што больш за ўсе кідаецца ў вочы савецкаму турысту і што так адрознівае нас ад іх, гэта тое, што там усё робіцца для дабрабыту чалавека (у дадзеным выпадку для іспанцаў) і, у першую чаргу, для сваіх, а потым ужо для гасцей. У нас жа гэта толькі на словах, а на справе: спачатку ўсё для замежных гасцей, а потым — для нас. Там гэта ўсе ведаюць і не вельмі адабраюць нашу такую «палітыку».

Ну вось, бадай, і ўсё. Я думаю, што дапамагла чытачу скласці хоць маленькае ўяўленне аб гэтай экзатычнай краіне, якая амываецца водамі Міжземнага мора і Атлантычнага акіяна.

**Г. ТАРАПЫНА.**

**Фота аўтара.**





Спорт

## Ж. ДАЛГАЧОВА— ДВУХРАЗОВАЯ ЧЭМПІЁНКА

У Сафіі завяршыўся чэмпіянат Еўропы па сучаснаму пяцібор'ю сярод жанчын. Выдатна выступіла на чэмпіянаце майстар спорту СССР міжнароднага класа Жана Далгачова, якая заваявала залатую ўзнагароду не толькі ў асабістых, але і ў камандных спаборніцтвах.

Нашым чытачам нагадаем, што ў мінулым годзе Жана стала студэнткай-завочніцай І курса факультэта фізічнай культуры, а, выступаючы ў Германіі ў саставе зборнай каманды СССР, заваявала Кубак свету.

Ад імя нашых чытачоў хочацца пажадаць Жане дасягнення новых спартыўных вяршынь.

**В. ЗАХАРАЎ.**

## ЗНОЎ ПЕРШЫЯ

У мінулыя святочныя дні праведзена гарадская лёгкаатлетычная эстафета па вуліцах нашага горада, у якой прымалі ўдзел ВНУ, тэхнікумы, вытворчыя калектывы і школьнікі.

Маршрут традыцыйнай эстафеты праходзіў па вуліцах Савецкай, Перамогі, праспекту Леніна, Інтэрнацыянальнай, Гагарына, Пралетарскай. Стартавалі і фінішавалі на плошчы Леніна.

Як і ў папярэднія гады, асноўная барацьба разгарнулася паміж камандамі універсітэта і Гомельскага вучылішча алімпійскага рэзерву.

Але ўжо з трэцяга этапа (а ўсяго адзінаццаць) нашы бегуны выходзяць у лідэры і да фінішу не ўступаюць перавагу. На фінішы разрыў паміж першым і другім месцамі дасягнуў метраў 50—60. Другой фінішавала каманда ВАР і на трэцім месцы каманда Гомельскага політэхнічнага інстытута.

На адным з этапаў за нашу каманду бегла майстар спорту Наталля Гардзіцкая — студэнтка факультэта фізічнай культуры. Адразу пасля фінішу яна сказала:

— Ведаеце, сёння наша каманда выступала проста цудоўна, а гэтаму садзейнічала добрае надвор'е і падтрымка шматлікіх гледачоў.

З рук старшыні гарспарткамітэта А. Пазднякова Наталля Гардзіцкая (капітан каманды) атрымала прыгожы Кубак, а кожны з удзельнікаў за перамогу атрымае яшчэ і грашовую ўзнагароду, якая не будзе лішняй для студэнта... Здаецца, што і спорт уступае ў рынач- ную эканоміку.

**В. МАРЧАНКА.**

## ДЛЯ АДПАЧЫНКУ

**У прафком студэнтаў універсітэта паступілі турыстычныя пуцёўкі:**

па маршруту **«Крымскі-аўтобусны»** — з 4.07 па 18.07. Кошт — 280 руб. (7 шт.). Адпачынак турыстаў у г. Сімферопалі на турбазе **«Таўрыя»** — 3 дні, у г. Алушце на т/б **«Чайка»** — 6 дзён, у г. Севастопалі ў турысцкай гасцініцы **«Крым»** — 6 дзён. Па гэтаму ж маршруту ёсць 8 пуцёвак з 3.08 па 17.08.

Турбаза **«Азёрная»**, п. Іванча, **Малдова** — з 13.09 па 6.10 (сямейныя, на 2 чал.). Кошт — 753 руб. (11шт.); (сямейныя, на 3-х чал.) — з 11.09 па 4.10 (20 шт.). Кошт — 1071 руб.; на 2-х дарослых, размяшчэнне ў 2-х мясцовых летніх доміках, зручнасці на тэрыторыі турбазы — з 3.07 па 26.07 (10 шт.) і з 20.08 па 12.09 (10 шт.). Кошт — 753 руб.

Турыстычныя маршрутныя пуцёўкі па **Краснадарскаму краю** працягласцю 20 дзён — з 21.07 па 9.08 (2 шт.). Кошт — 445 руб.

Турбаза **«Рамонак»** у **г. Пяцігорску** — 15 дзён, з 26.08 па 9.09. Кошт — 210 руб. (10 шт.).

Турпуцёўкі па маршруту **г. Краснадар — п. Кабардзінка**, т/б **«Маяк»** — на 18 дзён, з 8.07 па 25.07. Кошт — 326 руб. (10 шт.).

• • •

Камітэт камсамола універсітэта прапаноўвае для супрацоўнікаў і выкладчыкаў пуцёўкі на ліпень—верасень:

**г. Сімферопаль** — з 10.07 па 19.07 (30 чал.), пражыванне ў гасцініцы;

**г. Сімферопаль** — з 11.08 па 20.08 (30 чал.), пражыванне ў гасцініцы;

**г. Анапа** — з 6.08 па 25.08 (10 чал.), пражыванне ў прыватным сектары;

**г. Сочы** — з 30.08 па 13.09 (10 чал.), прыватны сектар;

**г. Херсон** — з 4.08 па 15.08 (30 чал.), пансіянат «Прыбой» і з 5.08 па 16.08 (30 чал.).

• • •

Прафком выкладчыкаў і супрацоўнікаў прапануе пуцёўкі: у санаторый-прафілакторый БДУ імя У. І. Леніна (ускраіна Мінска) 1 змена — з 7.06 па 30.06 (10 шт.); II змена —з 3.07 па 26.07 (25 шт.); III змена — з 29.07 па 21.08 (20 шт.).

Усе гэтыя пуцёўкі сямейныя, кошт кожнай з іх — 290 руб.

У піянерскі лагер «Цэсіс» (Латвія — 90 км ад Рыгі) для школьнікаў з 8 да 14 гадоў. І змена — з 3.06 па 27.06 (40 шт.); II змена — з 29.06 па 22.07 (30 шт.). Кошт адной пуцёўкі — 240 руб.

• • •

Для тых, хто яшчэ не вырашыў пытанне, дзе правесці свой адпачынак, Гомельская фірма «Фобас» прапаноўвае наступныя маршруты:

— з 25 мая ў **Феадосію**, гасцініца «Марак» на 15 дзён, кошт пуцёўкі — 581 руб.;

— з 26 мая ў **Планерскае** на 20 дзён, харчаванне на т/б. Кошт — 434 руб.;

— з 28 мая ў **Еўпаторыю** на 15 дзён. Кошт — 340 руб.;

— з 6 чэрвеня ў **Еўпаторыю** на 24 дні з водагразелячэннем. Кошт—466 руб.;

— з 13 чэрвеня ў **Сочы** на 15 дзён. Кошт — 490 руб.

Фірма «Фобас» забяспечвае праезд па ўсіх маршрутах.

Хто зрабіў свой выбар, тых чакаем з 9 да 18 гадзін па адрасу: вул. Кожара, 7, пад'езд 2, тэл. для даведак 57-48-88. Выхадны — нядзеля.

## Запрашаем на аздараўленчы сеанс

**Курыць — здароўю шкодзіць. Гэта ведае кожны дарослы чалавек. Многія курыльшчыкі і рады былі б пазбавіцца шкоднай звычкі, але аднаго жадання для гэтага мала — не хапае сілы волі, вытрымкі. У такім выпадку на дапамогу прыходзіць медыцына.**

**У пятніцу, 24 мая, у актавай зале нашага універсітэта адбудзецца аздараўленчы сеанс лячэння гіпнозам супраць курэння. Яго правядзе доктар медыцынскіз навук В. П. Дзядзічкін.**

**Пачатак — у 18.00.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.**

**«Гомельскі універсітэт» — газета Гомельского государственного университета им. Ф. Скорины, Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па друку, Гомель, Савецкая,1.**

**Аб'ём — 1 друк. арк. Тыраж 1500 экз. Заказ 347. Падпісана да друку ў 14.00.**